Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

Ігар Клімаў, *Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага*, БДУКМ, Мінск 2012, 337 с.

Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага (далей – ЕЦ) увайшло ў гісторыю пісьменнасці Беларусі як першы друкаваны пераклад Святога Евангелля на старабеларускую мову. Для славянскай культуры ўвогуле важнасць гэтага помніка абумоўлена тым, што ён з'яўляецца першым выданнем з набраным у два слупкі тэкстам паралельна на дзвюх мовах (царкоўнаславянскай і старабеларускай), у ім упершыню ва ўсходнеславянскім друку прадстаўлены маргіналіі, выкарыстаны наборныя рэйкі, у якія змешчаны падзелены на вершы евангельскі тэкст.

Сёння вядомы два экземпляры ЕЦ, адзін з іх захоўваецца у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, другі – у Архангельскім краязнаўчым музеі.

Гісторыя навуковага вывучэння ЕЦ філолагамі, кнігазнаўцамі, гісторыкамі налічвае больш за стагоддзе.

Да ліку сучасных вучоных, якім належыць найбольшы ўнёсак у лінгвістычнае асвятленне ЕЦ, адносіцца вядомы беларускі мовазнавец Ігар Клімаў. Ім у 1997 г. была абаронена кандыдацкая дысертацыя *Мова перакладу Евангелля В. Цяпінскага (графіка, арфаграфія, фанетыка)*, якой папярэднічалі асобныя артыкулы па гэтай праблематыцы. У 2012 г. убачыла свет манаграфія даследчыка *Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага*, прысвечаная: 1) аналізу выяўленых фанетычных, графіка-арфаграфічных, марфалагічных, сінтаксічных, лексічных рыс і 2) абгрунтаванню тэхнікі перакладу Васіля Цяпінскага.

Кніга складаецца з *уступу* (с. 6–8), пяці *глаў* (с. 9–323), *заключэння* (с. 324–325), *бібліяграфіі* (с. 327–337).

Глава 1. *Жыццё і дзейнасць В. Цяпінскага* (с. 9–43) складаецца з трох раздзелаў. У раздзеле 1. *Біяграфія В. Цяпінскага ў святле крыніц* робіцца спроба абагульнення існуючых звестак пра Васіля Цяпінскага, паколькі „ў шмат якіх працах дакладныя факты біяграфіі Цяпінскага нярэдка спалучаюцца з памылкамі, а то і проста з прыдумкамі" (с. 9). Аўтар вычарпальна аналізуе даследаванні У. Доўнар-Запольскага, Г. Галенчанкі, А. Лявіцкага, Я. Карскага і інш., а таксама даўнія дакументы, у якіх „адзіна надзейнымі трэба прызнаць толькі згадкі, што зыходзяць з пратэстанцкага лагера і характарызуюць Цяпінскага як удзельніка польска-беларускай Рэфармацыі" (с. 13).

І. Клімаў сцвярджае, што перакладчыкам Евангелля на старабеларускую мову і яго выдаўцом быў Васіль Мацвеевіч Цяпінскі з Латыголіч Менскага

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

павета (с. 23), „а не сын Мікалая, што з Цяпіна" (с. 23).[1] У пратэстанцтва ён перайшоў з каталіцкай веры; „у пратэстанцкай грамадзе […] адыгрываў далёка не апошнюю ролю – ён мог быць пастарам ці казнадзеем". Васіль Мікалаевіч служыў у коннай роце пад камандаваннем Філона Кміты Чарнобыльскага (каля 1567 г.), выступаў па даручэнні апошняга ў судзе (1582 г.). Жонкай Васіля Мікалаевіча была Зоф'я Жыжэмская, пляменніца Астафея Валовіча.

Паводле І. Клімава, „мэтай перакладу і выдання Цяпінскага была рэлігійная прапаганда, прычым не сярод простага народа, які ў сваёй масе быў непісьменны і мала цікавіўся тэкстам Евангелля, а сярод праваслаўнага духавенства" (с. 26, раздзел 2). Выразная вершаваная рубрыкацыя тэксту, наяўнасць маргіналій рабілі пераклад спрыяльным у першую чаргу для індывідуальнага чытання. Па меркаванні даследчыка, Цяпінскі пры публікацыі твора карыстаўся працай майстра (ці майстроў), а сам хутчэй за ўсё быў гаспадаром друкарні, месцазнаходжанне якой дакладна не вызначана. Часам выдання Евангелля лічыцца першая палова 1574 г. (с. 34).

У раздзеле 3. аўтар прыводзіць звесткі пра месцазнаходжанне помніка і яго аб'ём, дае яго кадыкалагічную характарыстыку, вызначае асаблівасці набору і афармлення, сістэматызуе памылкі друку, выкліканыя „звычайна няўважлівасцю наборшчыка і карэктара" (с. 43). Падзел тэксту перакладу на чатыры зоны (зона А займае 8 старонак, В – 27, С – 47, D – 35) заснаваны на іх арфаграфічных адрозненнях, абумоўленых „розначасавым наборам тэксту […] або наборам тэксту рознымі асобамі" (с. 39). У далейшых частках манаграфіі аўтар выкарыстоўвае дадзеную сегментацыю пры прэзентацыі вынікаў аналізу перакладнога тэксту (с. 52, 66, 67, 79, 199, 205 і інш.).

Глава 2. *Сістэма пісьма* (с. 44–68) прысвечана даследаванню сістэмы графікі і арфаграфіі ЕЦ. Так, у раздзеле *Графіка* аўтар 1) поўна апісвае параграфемныя сродкі – размяшчэнне асноўнага тэксту (Евангелле на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах) і дапаможнага (маргіналіі) на старонцы, інверсію, прагалы, вялікія літары, знакі прыпынку і пераносу слоў; 2) характарызуе шрыфт выдання (малюнак літар ЕЦ з'яўляецца перайманнем таго шрыфту, якім надрукаваны выданні Францыска Скарыны і Нясвіжскага катэхізісу), яго знакі для перадачы літар падзяляе на пяць рэгістраў (табліца на с. 48 манаграфіі), адзначае адсутнасць літар, якія ўспрымаліся як архаічныя, і ўвядзенне варыянтаў некаторых графем у сувязі з тэхнічнымі асаблівасцямі друкаванай кнігі; 3) вылучае два тыпы скарочаных напісанняў – кантракцыі ў перадачы nomina sacra і напісанні з вынаснымі зычнымі літарамі – суправажаючы іх колькаснымі падлікамі; 4) паказвае ролю надрадковых знакаў – паерыка (над зычнымі), псіля, ісы, варыі (над галоснымі), цітлы.

[1] Параўн.: „Яго [Евангелля – Рэц.] перакладчык і выдавец Цяпінскі (Амельяновіч) Васіль Мікалаевіч […]" (У. Свяжынскі, *Евангелле Цяпінскага,* [у:] *Беларуская мова*: *Энцыклапедыя*, Мінск 1994, с. 198).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

У раздзеле *Арфаграфія* выяўлены функцыі ў тэксце Евангелля надрадковых знакаў над галоснымі, паерыка, ёраў, ѣ, варыянтных галосных і зычных, а таксама нефанетычныя хістанні ва ўжыванні літар *и* / *ї* і *ы*; *и* / *ї* і *е*. У прыватнасці, аўтар сцвярджае, што выкарыстанне надрадковых знакаў падпарадкавана традыцыі; літара ѣ фіксуецца ў пазіцыях як этымалагічна апраўданых (86 разоў), так і этымалагічна неапраўданых (231 раз), у перакладзе яна „выконвае выключна графічную ролю"; спецыялізацыя дублетных літар – у залежнасці ад іх пазіцыі ці фанетычнага значэння – строга не вытрымана.

Главу 3. *Мова перакладу* (с. 69–182) пачынае раздзел *Навуковае знаёмства з мовай перакладу В. Цяпінскага*, у якім прапаноўваюцца і каментуюцца вядомыя сёння пункты гледжання на мову перакладу, а таксама робіцца агляд бібліяграфіі па акрэсленай тэме, пры гэтым звяртаецца ўвага на этапныя працы (Я. Карскі, С. Некрашэвіч, А. Жураўскі, М. Муталімава, І. Клімаў, К. Смірнова).

Аналіз фанетычных з'яў, якія рэпрэзентуюцца ў перакладзе Евангелля, дазволіў даследчыку прыйсці да наступных высноў: аканне прадстаўлена адзінкавым выпадкам; еканне адзначаецца ў каранях слоў, у суфіксах дзеепрыметнікаў незалежнага стану цяперашняга часу, у энклітычных займенніках; пераход *е* ў *о* адлюстраваны пасля шыпячых і *ц*, непаслядоўнасць яго пісьмовай перадачы звязана з „чаргаваннем у парадыгме слова формаў з цвёрдым або мяккім зычным пасля галоснага" (с. 82); асіміляцыйная мяккасць фіксуецца ў 513 выпадках; аглушэнне і азванчэнне зычных мае месца пераважна ў прыназоўніках на *з, с, д, т* і на стыку кораня і прыстаўкі.

У раздзеле 3.3 *Марфалагічныя з'явы* вылучаны і дэталёва апісаны паказальныя для перакладнога тэксту адметнасці ў формазмяненні самастойных часцін мовы, а таксама ў словаўтварэнні прыслоўяў. Напрыклад, пры апісанні катэгорый і формаў дзеяслова І. Клімаў аналізуе інфінітывы, формы цяперашняга і простага будучага часу (1-ая і 3-яя ас. адз. і мн. л.), спосабы афармлення складанага будучага часу, перфекта і дзеепрыслоўя.

Асаблівасці сінтаксічнага ладу перакладу Евангелля, паводле І. Клімава (раздзел 3.4), утвараюць канструкцыі параўнання; недапасаванне зборных назоўнікаў да выказніка ў ліку; словазлучэнні з беспрыназоўнікавым кіраваннем тыпу *ожениться мною, панують ими, по правицы тебе*; выражэнне дапаўнення пасля пераходнага дзеяслова назоўнікамі ў вінавальным, родным і назоўным склонах; спалучэнне прыназоўнікаў з асобнымі склонамі; захаванне дзеяслова-звязкі ў састаўным выказніку (пад уплывам царкоўнаславянскага арыгінала), наяўнасць пры дзеясловах (*быти*, *называти*, *наречи*) Nominativus praedicativus і яго замена Instrumentalis praedicativus.

Лексіку перакладнога тэксту Евангелля (раздзел 3.5) І. Клімаў вызначае як высокаапрацаваную. Рэлігійныя лексемы і тэрміны В. Цяпінскі імкнуўся часткова абнавіць за кошт паланізмаў, „аднак пры гэтым […] пазбягаў неўсталяваных польскіх тэрмінаў і выразных паланізмаў, перш за ўсё фанетычных і марфемных" (с. 159). Тапонімы і антрапонімы афармлены ў асноўным на ўзор царкоўна-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

славянскай традыцыі, што, „безумоўна, было свядомым выбарам" перакладчыка. У слоўнікавым складзе перакладу сярод запазычанняў дамінуюць паланізмы (фанетычныя, дэрывацыйныя, лексічныя і семантычныя), таксама фіксуюцца лацінізмы, грэцызмы, семітызмы, царкоўнаславянізмы, багемізмы і германізмы.

У падраздзеле 3.6.1 І. Клімаў, аспрэчваючы думку М. Талстога адносна старабеларускіх тэкстаў як „эксперыментаў", „маніфестацый", „пераходных варыянтаў" паміж царкоўнаславянскай і/ці польскай мовамі (с. 170), справядліва сцвярджае: „Такія творы былі праявамі шырокага працэсу развіцця літаратурна-пісьмовай мовы, што налічвала ў сваім існаванні некалькі стагоддзяў і ў 2-ой палове XVI ст. увайшла ў перыяд апагею" (с. 170). Пасля пераліку наяўных у перакладзе ўсходнеславянскіх моўных рыс (9 фанетычных і 9 марфалагічных) даводзіцца, што „пэўная арыентацыя перакладу Цяпінскага на польскія і царкоўнаславянскія ўзоры ніяк не памяншае самастойнасці яго старабеларускай мовы" (с. 172). На аснове выяўленых фанетычных, марфалагічных, сінтаксічных і лексічных асаблівасцей перакладу аўтар даказвае 1) адсутнасць яркіх лакальных (дыялектных) паказчыкаў, абумоўленую прызначэннем тэксту шырокаму колу карыстальнікаў (с. 175); 2) прыналежнасць мовы Цяпінскага да беларускіх гаворак (с. 178).

Глава 4. *Характар перакладу* (с. 183–297) прысвечана разгляду крыніц і тэхнікі перакладу ў ЕЦ. Яшчэ ў XIX ст. пытанне пра арыгінал, з якога быў зроблены пераклад Цяпінскага, вырашалася на карысць уласна славянскіх крыніц (П. Уладзіміраў, І. Первольф, А. Сабалеўскі, Я. Карскі). У 2-ой палове XX ст. было зноў пацверджана, што арыгіналам Цяпінскаму служыў царкоўнаславянскі тэкст, надрукаваны ў ЕЦ (А. Жураўскі, Л. Шакун, У. Анічэнка, А. Супрун, І. Клімаў). Паводле ж Г. Ротэ, які ўпершыню сабраў і апублікаваў шматлікія даныя па перадачы лексікі ў ЕЦ, Цяпінскі выкарыстоўваў шэраг польскіх перакладаў (напр., Біблію ў перакладзе Сымона Буднага [Нясвіж 1572]). Сярод дадатковых арыгіналаў і крыніц, да якіх звяртаўся Цяпінскі, І. Клімаў называе, акрамя польскіх, асобныя царкоўнаславянскія выданні (напр., *Евангелле вучыцельнае* (Заблудаў 1569), Апостал, выдадзены Ф. Скарынам [Вільня, 1522]), выданне грэчаскага і лацінскага тэкстаў Новага Запавету, здзейсненага Тэадорам Бэзам. Зварот да Новага Запавету ў перакладзе Сымона Буднага (Нясвіж, 1574) адмаўляецца (ён быў надрукаваны пасля выхаду ЕЦ [с. 192–197]).

Крыніцай Евангелля на царкоўнаславянскай мове для В. Цяпінскага стала так званае вузкашрыфтнае Евангелле (ВЕ; Масква, каля 1553–1554 гг.). Вылучаны наступныя асаблівасці царкоўнаславянскага тэксту ў ЕЦ: 1) даволі дакладны паўтор ВЕ (лексіка, колькасць і парадак слоў); 2) ігнараванне многіх графічных і арфаграфічных рыс ВЕ, 3) наяўнасць вялікай колькасці ўсходнеславянскіх і беларускіх рыс. Апошняя з'ява ўжо прыцягвала ўвагу даследчыкаў. Так, А. Жураўскі палічыў магчымым разглядаць дадзены тэкст як самастойны беларускі „звод". На думку ж І. Клімава, тут у значнай ступені паўплывала няўвага наборшчыка(ў) і карэктара(ў) да царкоўнаславянскай арфаграфіі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

У другім раздзеле главы 4 разглядаецца тэхніка перакладу ў ЕЦ. Пераклад Цяпінскага І. Клімаў апісвае як перайманне царкоўнаславянскага арыгінала з нешматлікімі адхіленнямі, звязанымі з улікам польскіх і іншых перакладаў, а таксама (рэдка) з самастойнымі рашэннямі перакладчыка (с. 202). Цяпінскі прытрымліваўся паслоўнага прынцыпу перакладу, асаблівасці рэалізацыі якога абумоўлены яго задачамі па перакладзе і прадстаўлены разыходжаннямі ў колькасці і парадку кампанентаў сказа (*прелюбы творить – ѡложити – cudzołoży, бесъплодъно – безъ овощу – bez owoci; по нем ити – ити за нимъ – iść za nim*). Асобна вылучае даследчык змену перакладчыцкай стратэгіі ў Мк. параўнальна з Мц., дзе пачынае практыкавацца кантэкстуальны пераклад, што праяўляецца ў спарадычным увядзенні слоў, словазлучэнняў, марфем (рэдка). Крыніцай большасці ўвядзенняў І. Клімаў называе Біблію ў перакладзе Сымона Буднага (Нясвіж 1572); шэраг дадаванняў (часціц, злучнікаў), на яго думку, належыць самому Цяпінскаму.

Цікавыя назіранні аўтара над 1) заменай адной часціны мовы на іншую (вылучаны мена дзеяслова (дзеепрыметніка) і назоўніка (прэдыкатыва); мена назоўніка і субстантыва, мена назоўніка і ад'ектыва, мена атрыбутыўнай і генетыўнай канструкцый); 2) перадачай асобных граматычных формаў (захоўваюцца формы, агульныя для царкоўнаславянскай і старабеларускай моў, змены закранулі формы, зніклыя ва ўсходнеславянскіх мовах [парны лік, аорыст, імперфект]); 3) перакладам склонавых і прыназоўнікавых канструкцый (часам мелі месца змены склону і/ці прыназоўніка, што служылі адным з асноўных перакладчыцкіх прыёмаў Цяпінскага [*очистисѧ ему проказа → очистилсѧ его трудъ ← oczyścił się trąd iego*]); 4) месцам азначэння адносна азначальнага слова; 5) ужываннем поўнай і кароткай формаў у ад'ектывах (*плодъ добръ → овощъ добрый*); 6) ужываннем прыназоўнікаў (*мене ради → мене деле*); 7) перадачай энклітычных формаў займеннікаў, царкоўнаславянскіх калек, спецыфічных грэчаскіх зваротаў, звароту *Dativus absolutus* і інш.

Найбольшай разнастайнасцю вылучаюцца ў ЕЦ змены прыназоўнікаў. Так, пры дзеяслове выяўлены тры віды замен: прыназоўнікавай канструкцыі – беспрыназоўнікавай, беспрыназоўнікавай канструкцыі – прыназоўнікавай, аднаго прыназоўніка – іншым. Апошняя замена – найбольш частотная, прычым, як правіла, прыназоўнікавая канструкцыя царкоўнаславянскага тэксту замяняецца на канструкцыю з польскай крыніцы (*на крщение → до хрьстѹ ← do krsczenia*).

Марфемнае калькаванне арыгіналаў у перакладзе наўрад ці было мэтай перакладчыка. І. Клімаў тлумачыць гэта тым, што „ў Цяпінскага бадай не было асаблівай патрэбы практыкаваць калькаванне з прычыны блізкай роднасці моў яго арыгінала(ў) і перакладу" (с. 244). Адзіны выпадак калькавання ў Цяпінскага – перадача *из-*/*ис-* праз *вы-*, на што ўжо звярталася ўвага даследчыкаў (*избранныхъ → выбраныхъ, испытоваше → выпыталъсѧ*). Па назіраннях І. Клімава, такія суадносіны паміж прэфіксамі не вельмі рэгулярныя, нярэдка *из-*/*ис-* перадаецца па-іншаму: бяспрэфіксна (*изъбавъление → окупом*), праз іншыя прэфіксы (*исповем имъ → ѡповемъ имъ, иссохшу – ѹсохши, исказишѧ → сказили*).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

Вывучэнне лексікі двух слупкоў (арыгінала і перакладу) дазволіла ўстанавіць чатыры тыпы лексічных адпаведнасцей, якія „адлюстроўваюць фактычна чатыры стратэгіі, што практыкаваў Цяпінскі пры перадачы лексікі ў сваім перакладзе" (с. 248). Паводле суадносін каранёвых і афіксальных марфем зафіксавана поўнае супадзенне лексем, амаль поўнае супадзенне лексем, частковае супадзенне лексем, поўнае несупадзенне лексем. Аналіз стратэгій перакладу лексікі дазваляе гаварыць як аб залежнасці выбару Цяпінскім эквівалентаў ад іншаславянскіх крыніц (царкоўнаславянскага і польскіх арыгіналаў), так і аб яго арыентацыі пры перакладзе на ўсходнеславянскую лексіку, асобныя варыянты іншых царкоўнаславянскіх крыніц, уласнае маўленне.

І. Клімаў акцэнтуе ўвагу на аднастайнасці і стабільнасці перакладу ў ЕЦ. Адны і тыя ж словы царкоўнаславянскага тэксту Цяпінскі па магчымасці перадае аднолькавымі эквівалентамі (напр., дагматычна важныя тэрміны, прыслоўі, займеннікі, службовыя словы). Спыніўшыся на праблеме дакладнасці і правільнасці перакладу (маецца на ўвазе семантычная эквівалентнасць арыгіналу), І. Клімаў канстатуе наяўнасць у ЕЦ мноства прыкладаў удалага перакладу, хаця, як ён піша далей, такім пераклад Цяпінскага можна лічыць не заўсёды. Прычыну гэтага аўтар бачыць у выкарыстанні лексем царкоўнаславянскага слупка ці іх мадыфікацыі (*исткни <око> → выторгни око*>), семантычных або лексічных паланізмаў (*рыдание → нареканье*), ва ўжыванні рэдкіх ці неадпаведных слоў і выразаў (*изведоша → выпхнѹлї*), у кепскім разуменні арыгінала (*послаша тощь → отослалї тощого*) і інш. На думку І. Клімава, у шэрагу выпадкаў незвычайны, нетыповы пераклад мае ідэалагічны падмурак, магчыма, абумоўлены пэўнай рэлігійнай дактрынай (с. 286).

Стылістыка перакладу ў ЕЦ непасрэдна звязана са стылістыкай арыгіналаў, якім Цяпінскі паслядоўнічаў у сінтаксісе, граматыцы і лексіцы. Да стылістычнай апрацоўкі тэксту аднесены выпадкі ўніфікацыі лексічных варыянтаў (*алавастръ, сткляница → скленица*), змены граматычных значэнняў і формаў (*Небо и землѧ проминеть*), захаванне таўталогій (*ѹжасошасѧ ѹжасомъ → злекълисе злекленьемъ*), пазбяганне архаічных і дыялектных элементаў, стылістыка ў межах фразы (захаванне ў паўторах і градацыях каранёвай разнастайнасці), рытмізацыя асобных фраз (рыфма ў фіналях дзеясловаў). У сувязі з апошняй з'явай аўтар уздымае пытанне: „Ці не адлюстроўваюць яны нейкую практыку вуснага ўжытку асобных фрагментаў Евангелля ў пратэстанцкай грамадзе Цяпінскага?" Стылістычная адметнасць ствараецца таксама наяўнасцю паланізмаў (хаця, як слушна заўважае аўтар, гэта было ўласціва для ўсёй старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове канца XVI ст.).

Глава 5. манаграфіі *Тэксталагічныя росшукі В. Цяпінскага* (с. 298–323) прысвечана разгляду характару маргіналій і крыніц этымалогій і цытат у іх. Маргіналіямі называюцца любыя каментарыі публікатара да асноўнага тэксту кнігі, змешчаныя на яе маргінэсе (гл. с. 298). У ЕЦ маргіналіі суправаджаюць абодва слупкі евангельскага тэксту. Тут змешчаны заўвагі перакладчыка да тэксту Евангелля, пададзены назвы і нумарацыя евангельскіх раздзелаў, перыкоп, указанні

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

на паралельныя месцы Святога Пісьма, розначытанні з іншых перакладаў, этымалогіі многіх запазычанняў (указанні на паходжанне асобных семітызмаў, грэцызмаў ці лацінізмаў). Выкарыстанне маргіналій, заўважае І. Клімаў, уздымала статус і прэстыжнасць ЕЦ, садзейнічала выкананню прапагандысцкай задачы: папулярызацыі і абгрунтаванню пратэстанцкай дактрыны (с. 301). У адрозненне ад ранейшых даследчыкаў (А. Жураўскі, Г. Ротэ) І. Клімаў не лічыць маргіналіі ЕЦ дапаможнымі заўвагамі наконт лексікі, падкрэслівае, што яны не з'яўляюцца прыёмам каментаванага перакладу і ў цэлым маюць філалагічны характар. Галоўнай асаблівасцю, якая адрозніває ЕЦ ад усіх усходнеславянскіх і ад многіх польскіх выданняў, І. Клімаў называе адсутнасць у маргіналіях спасылак на Айцоў Царквы, на рэлігійную дактрыну, алегарычных інтэрпрэтацый, царкоўна-дагматычнага тлумачэння асобных біблейных сюжэтаў, паняццяў ці рэалій. Ён дапушчае магчымасць таго, што „ў сваіх маргіналіях Цяпінскі імкнуўся пазнаёміць сваіх праваслаўных чытачоў з набыткамі тагачаснай філалогіі і з разнастайнасцю перакладчыцкай традыцыі" (с. 308).

Вылучаны два віды спасылак на цытаваныя ў ЕЦ царкоўнаславянскія пераклады: на ВЕ і на евангельскія службовыя кодэксы. І. Клімаў лічыць, што Цяпінскі выкарыстоўваў тры рэдакцыі царкоўнаславянскага Евангелля: старажытную (IX ст.) прэслаўскую (X–XI стст., менавіта яе, па назіраннях аўтара, найчасцей цытуе перакладчык у маргіналіях), афонскую (з XIV ст.). Сапраўды, спасылкі Цяпінскага на розныя старажытныя рэдакцыі царкоўнаславянскага Евангелля з упэўненасцю можна назваць унікальнай з'явай у тагачаснай еўрапейскай філалогіі, бо „ўпершыню ў свеце ён прыклаў рэнесансную метадалогію да царкоўнаславянскага матэрыялу і атрымаў вынікі, якія ў многім супадаюць з сучаснымі здабыткамі ў тэксталогіі царкоўнаславянскага Евангелля" (с. 316).

У маргіналіях ЕЦ цытуюцца таксама польскія і некаторыя іншыя заходнееўрапейскія крыніцы. Паводле зместу І. Клімаў падзяляе гэтыя цытаты на лексіка-граматычныя варыянты, тэксталагічныя фрагменты (тут адзначаны дадаткі або пропускі асобных чытанняў), тлумачэнні семантыкі некаторых слоў і выразаў. Пры разглядзе лексіка-граматычных варыянтаў адзначаны частотныя разыходжанні цытат на палях з адпаведнымі чытаннямі польскіх крыніц (падобныя несупадзенні выяўлены і пры перадачы царкоўнаславянскіх цытат). На думку І. Клімава, гэта звязана з тым, што Цяпінскі мог свядома змяняць адрозныя ад старабеларускай мовы польскія формы, мог таксама цытаваць па памяці ці па некаторых іншых перакладах.

У Заключэнні (с. 324–326) прыводзяцца асноўныя вынікі, атрыманыя ў ходзе аналізу ЕЦ.

Праца выканана І. Клімавым на высокім навуковым узроўні і канцэптуальных заўваг у рэцэнзентаў не выклікае. Лічым, аднак, што варта было б абгрунтаваць выкарыстанне намінацыі *Літоўская Метрыка* (замест *Метрыка Вялікага Княства Літоўскага*), некаторых тэрмінаў (напр., *гемінацыя*, *ітэратыў, кантракцыя*, *ініцыяль; заназоўнік*); удакладніць часцінамоўную прыналежнас-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

ць асобных слоў (с. 204, 249); папоўніць бібліяграфічны спіс асобнымі працамі І. Будзько (па перакладчыцкай тэхніцы).

Манаграфія І. Клімава *Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага* з'яўляецца першым шматаспектным даследаваннем ЕЦ, у якім ажыццёўлены комплексны аналіз мовы твора; выяўлены прыёмы перакладчыцкай тэхнікі В. Цяпінскага, устаноўлены асаблівасці маргіналій у тэксце; удакладнены звесткі пра асобу Цяпінскага, час падрыхтоўкі перакладу.

Безумоўна, праца закладвае падмурак і для новых напрамкаў навуковага асэнсавання ЕЦ, напр., яго параўнання з іншымі перакладнымі евангеллямі; выяўлення ступені самастойнасці Цяпінскага ў падачы паралельных месцаў у маргіналіях і інш.

Вынікі манаграфіі маюць каштоўнасць для правядзення будучых гісторыка-лінгвістычных доследаў, накіраваных на далейшае асвятленне ўнутранай і знешняй гісторыі беларускай літаратурнай мовы; іх варта ўлічыць у даведачных выданнях і вучэбнай літаратуры пры канкрэтызацыі інфармацыі пра Васіля Цяпінскага, знакамітага беларускага дзеяча другой паловы XVI ст., і яго дзейнасць.

Кніга ўяўляе цікавасць для мовазнаўцаў, гісторыкаў, літаратуразнаўцаў, кнігазнаўцаў, а таксама ўсіх, хто мае жаданне спасцігнуць гісторыю беларускай культуры.

Наталля Паляшчук, Эльвіра Ярмоленка

Альгерд Бахарэвіч, *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча*, „Радыё свабодная Эўропа/Радыё Свабода", Мінск 2012, 428 с.

Новая кніга Альгерда Бахарэвіча – вядомага беларускага пісьменніка, які жыве ў Гамбургу – прысвечана найлепшым здабыткам беларускай літаратуры, якую аўтар па-свойму любіць і разумее. Не з усімі думкамі аўтара можна пагадзіцца, не ўсе раздзелы кнігі напісаныя на аднолькава высокім узроўні, аднак сам факт з'яўлення падобнага праекту ў беларускай культурнай прасторы радуе і выклікае павагу да аўтара – хаця б за смеласць і арыгінальнасць задумы.

Праўда, пра арыгінальнасць задумы можна казаць выключна ў межах беларускай традыцыі, па „гамбурскім рахунку" новая кніга Бахарэвіча ўяўляе сабой тыповы „антыпадручнік", знаным узорам якога з'яўляецца напісаная ў 1989 г. у Нью-Йорку кніга Пятра Вайля і Аляксандра Геніса *Родная речь. Уроки изящной словесности*. У прадмове да кнігі расійскія аўтары-эмігранты папярэджвалі расійскіх чытачоў: „Чытаць галоўныя кнігі рускай літаратуры – усёроўна, што пераглядаць наноў сваю біяграфію. Жыццёвы вопыт узбагачаецца разам з чытаннем і дзякуючы яму. Дата, калі ўпершыню быў раскрыты Дастаеўскі, не менш важная, чым сямейныя гадавіны. Мы расцем разам з кнігамі – яны растуць у нас. І калісьці прыходзіць час бунту супраць закладзеных у дзяцінстве адносінаў да

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

класікі. […] Мы задумвалі гэтую кнігу не столькі дзеля таго, каб аправергнуць школьную традыцыю, колькі дзеля таго, каб праверыць – і нават не яе, а сябе ў ёй" (пераклад мой – С.К.).

Аўтабіяграфічны момант вельмі важны і для беларускага пісьменніка, у прадмове да *Гамбурскага рахунку…* Бахарэвіч успамінае сваю школьную настаўніцу па мянушцы Жаба, якая надоўга адбіла ў яго жаданне дабраахвотна чытаць беларускую літаратуру. Чаму ж праз шмат гадоў у далёкай Нямеччыне ён раптам звярнуўся да „нялюбых" тэкстаў, вырашаў іх уважліва перачытаць, дапоўніўшы школьную праграму універсітэцкай, і падзяліцца сваімі ўражаннямі спачатку са слухачамі „Радыё Свабоды", а потым і з чытачамі? Свой учынак Бахарэвіч тлумачыць як збегам жыццёвых абставінаў („ад беларускай клясыкі, як ад торбы і турмы, нікому нельга заракацца"), так і свядомым жаданнем вывесці беларускую літаратуру з родных засценкаў на шырокі еўрапейскі прастор, даць ёй бязлітасную, справядлівую ацэнку па вышэйшым, гамбурскім рахунку: „Да свайго прынята ставіцца больш паблажліва, чым да чужога – нібыта свойскасць здольная кампэнсаваць сабой хібы і пустаслоўі. *Гамбурскі рахунак* – гэта кніга-спадзеў, спадзеў на тое, што беларуская літаратура заслугоўвае больш строгага погляду. Гэта абсалютна прыватная спроба зазірнуць на яе, пазбавіўшыся прыцяжэння той школьнай дошкі, стоячы каля якой мы ўсё яшчэ намацваем у падсвядомасьці пазычаную ў кагосьці шпаргалку павагі".

Без павагі і аглядкі на аўтарытэты, але з патаемнай любоўю – вось квінтэсэнцыя бахарэвічаўскага падыходу да беларускай літаратуры. Пры чым, у некаторых эсэ любоў гэтая настолькі патаемная, што ёсць небяспека прыняць яе за нянавісць: як слушна заўважылі тыя ж Вайль з Генісам, чытачы схільныя ўспрымаюць любую крытыку ў адрас айчынных класікаў як абразу Радзімы. Папрокі ў знявазе класікаў і Бацькаўшчыны неаднаразова даводзілася чуць і Бахарэвічу, асабліва дасталося яму за эсэ *Цёмнае мінулае Каяна Лупакі* пра творчасць Янкі Купалы пасля 1930-га года ды за агульны нігілізм радыёперадач пра „стаўпоў" беларускай савецкай літаратуры: Крапіву, Броўку, Куляшова ды інш. Безумоўна, многія разделы *Гамбурскага рахунку Бахарэвіча* можна разглядаць у кантэксце шматгадовай дыскусіі пра стаўленне да савецкай спадчыны, як інтэртэкстуальны працяг артыкулаў *Ружовы туман* Сяргея Дубаўца і *Лірыка чырвонага стагоддзя* Андрэя Вераб'я. Але крытычны, з'едлівы разгляд знакавых тэкстаў беларускага соцрэалізму – п'есы *Хто смяецца апошнім* Крапівы ці паэмы *Сцяг брыгады* Куляшова – не сведчыць пра пагарду Бахарэвіча да ўсёй беларускай літаратуры савецкага перыяду, каб пераканацца ў гэтым варта прачытаць раздзелы, прысвечаныя Міхасю Лынькову, Івану Мележу, Максіму Танку, Пімену Панчанку, а тым больш раздзелы, прысвечаныя ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў: Уладзіміру Жылку, Уладзіміру Дубоўку, Лукушу Калюгу, Паўлюку Шукайлу, Андрэю Мрыю. Безумоўна, аўтару ўласцівы здаровы антысаветызм, ён не прымае твораў, прасякнутых камуністычнай ідэалогіяй, але наіўны нацыяналізм таксама яму чужы, эстэтычны крытэрый у ацэнцы твора для яго важнейшы за ідэалагічны. „Нігіліст" і „антысаветчык" Бахарэвіч захапляецца

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

майстэрствам ранніх апавяданняў камуніста Міхася Лынькова, а вось мастацкую каштоўнасць рамана Кастуся Акулы *Змагарныя дарогі* ацэньвае досыць строга: „[…] Ад тыповай савецкай прозы «пра вайну і немцаў» гэтая кніга Дарог і Змаганьня адрозніваецца хіба знакам, а ня сутнасьцю. *Дарогі* – гэта твор выразна антысавецкі, а з антысаветызмам у літаратуры наядаешся гэтаксама хутка, як і ўзоромі савецкага мастацтва. Рэч у эстэтыцы – а яна ў *Змагарных дарогах* прыкладна такая самая, як і ў савецкіх аўтараў".

Не прымаючы ідэалогію ў літаратурным творы, аўтар *Гамбурскага рахунку…* імкнецца і *ўспрыманне* літаратурнага твора вызваліць ад ідэалогіі, ад навязаных школьным дыскурсам простых схемаў і стэрэатыпаў, прапануе перагледзіць усталяваную іерархію каштоўнасцяў. Мішэнямі Бахарэвіча з'яўляюцца не самі пісьменнікі, а іх „забранзавелыя помнікі", сціплы нацыянальны пантэон „багоў" і вераванняў. Пры чым Бахарэвіч не змагаецца супраць гэтых багоў і вераванняў, ён толькі хоча забраць іх з-пад улады жрацоў-літаратуразнаўцаў і аддаць простым вернікам-чытачам. Па-просту кажучы, прапануе не *вывучаць*, а *чытаць* беларскую літаратуру. І падае прыклад, як гэта рабіць, якую „магію" ужыць, каб зашмальцаваны ў школьным і універсітэцкім ужытку твор зрабіўся жывым, блізкім і, галоўнае, цікавым.

Магічныя метады, якія выкарыстоўвае аўтар *Гамбурскага рахунку…* для „ажыўлення" белліту палягаюць на перанясенні творчасці таго ці іншага беларускага пісьменніка ў кантэкст: 1) сусветнай літаратуры 2) постмадэрновай сучаснасці 3) біяграфіі і эстэтычных уяўленняў А. Бахарэвіча.

Такім чынам *Авантуры майго жыцця* Саламеі Пільштыновай Русецкай чытаюцца пад уражаннем ад кнігі Архана Памука пра Стамбул, у вершы Паўлюка Багрыма *Зайграй, зайграй, хлопча малы* нечакана адшукваюцца паралелі з раманам *Бляшаны бубен* Гюнтэра Граса, развагі пра паэму *Тарас на Парнасе* падмацоўваюцца цытатамі з эсэ Олдаса Хакслі, *Пінская шляхта* Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча супрацьстаўляецца з *Пэр Гюнтам* Генрыка Ібсэна, *Гутарка Данілы са Сцяпанам* успрымаецца як дыялог Эстрагона і Уладзімера з п'есы Самюэля Бэкета *У чаканні Гадо* і г.д.

Некалі Міхаіл Бахцін слушна заўважыў, што дзве цытаты з розных твораў пастаўленыя побач уступаюць паміж сабой у культурны дыялог і ўтвараюць новы сэнс. Парадаксальнае і не заўсёды карэктнае з навуковага пункту гледжання супастаўленне хрэстаматыйных твораў беларускай літаратуры з сусветнай класікай дазваляе, аднак, аўтару *Гамбурскага рахунку…* паказаць гэтыя творы ў нечаканым ракурсе, дапамагае заўважыць сапраўды цікавыя паралелі, адзначыць універсальныя рысы. Вось жа герой верша Паўлюка Багрыма, адпраўлены ў царскае войска, шкадуе, што ў дзяцінстве на яго не сеў кажан, „каб я большы не падрос ды ад бацькавых калёс", а ягоны равеснік, нямецкі хлопчык Оскар адмаўляецца расці, каб не быць прызваны ў фашысцкую армію. Сусвет герояў *Пінскай шляхты* аказваецца надзвычай герметычным і самадастатковым, калі параўноўваць яго з неабсяжным і трагічным сусветам вандроўніка Пэр Гюнта.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

Разважлівая гутарка двух беларускіх сялян пра царскую рэформу 1861 г. гучыць як філасофскі дыялог з драмы абсурду, калі вырваць яе з гістарычных рэалій і ўспрымаць з перспектывы сённяшняга часу.

З перспектывы сённяшняга часу, з улікам досведу сучаснага чалавека разглядаюцца ў *Гамбурскім рахунку* […] і іншыя творы беларускай літаратуры, пра што сігналізуюць ужо назвы асобных эсэ: *Кіно 1866 году*, *Бог не роўна delete*, *Сумны крошынскі джаз*, *Курсіў чарнакніжніка*, *Нязносная зычнасць шыпячых*, *Ашалелы ў пакоі сьмеху*, *Канец сэрыялу* і інш. Свядомая мадэрнізацыя выбраных для чытання твораў адбываецца як на сэнсавым ўзроўні, так і на моўным. „Паэму *Тарас на Парнасе* з поўным правам можна лічыць першым псыхадэлічным творам беларускай літаратуры", – смела сцвярджае Бахарэвіч і інтэрпрэтуе аповяд Тараса пра падарожжа на Парнас як вынік доўгага знаходжання палясоўшчыка на макавым полі. Аўтар *Гамбурскага рахунку…* звяртае ўвагу на тую дзіўную акалічнасць, што ўсіх класікаў рускай літаратуры просты селянін Тарас ведае ў твар і задае аўтару *Тараса на Парнасе* слушнае пытанне: „Наўрад ці клясыкі насілі бэджы з імёнамі. Па тэлевізары ён іх бачыў, ці што?"

Багушэвічаўскага Аліндарку Бахарэвіч называе першым беларускім тэрарыстам і прыходзіць да сумнай высновы: „Паэмаю ў прозе *Кепска будзе* Багушэвіч запачаткаваў у новай беларускай літаратуры жанр „турэмнага дзёньніка". На жаль, дагэтуль актуальны – бо „нявінных памежы нас шмат", расейскія сьледчыя ў кабінетах калышуць нагамі, выбіваючы зь беларусаў беларускі дух […]". Аўтар *Гамбурскім рахунку…* не згодны лічыць п'есу Кандрата Крапівы *Хто смяецца апошнім?* замаскаваным памфлетам супраць сталінізму, як гэта прапануюць школьныя і універсітэцкія падручнікі, а калі гіпатэтычна прымае такі пункт гледжання – іранічна інтэрпрэтуе вобраз Гарлахвацкага як адзінага станоўчага героя п'есы, удзельніка антысавецкага падполля, змагара супраць камунізму ва Украіне і Беларусі.

Мадэрнізацыя літаратурных твораў прыводзіць да зацірання іх генатыповых рысаў і прыкметаў эпохі, у значнай ступені дэфармуе іх першапачатковы сэнс, але затое максімальна набліжае да сучаснага чытача, робіць актуальным і зразумелым у сённяшніх грамадска-палітычных і культурных рэаліях, а менавіта такую мэту ставіў сабе аўтар *Гамбурскага рахунку…*, рызыкуючы пакрыўдзіць шматлікіх даследчыкаў беларускай літаратуры, якія старанна ўзнаўляюць культурна-гістарычны кантэкст узнікнення таго ці іншага шэдэўра і аналізуюць яго ідэйна-мастацкі змест ў эстэтычнай сістэме той эпохі, калі ён быў напісаны. Зрэшты, рызыка пакрыўдзіць і абразіць была калі не свядомая, то ўсвядомленая аўтарам *Гамбурскага рахунку…*, пра што сведчаць наступныя пасажы: „[…] пінскай местачковай шляхце хацелася выпіць і пабіцца, а менскай навуковай шляхце хочацца займець свайго шэксьпіра, хай і ў такі дзіўны спосаб"; „[…] беларускія савецкія літаратары, збольшага вясковыя мужычкі, якія некалі паўцякалі ад абавязковых калгасных працадзён у літаратуру"; „[…] каратке вічa сёньня надышоў час абараняць. Ад таго тупога і карыкатурнага ў сваім бясьсіллі калгаснага нацыяналізму, нібыта апазыцыйнага, але насамрэч цалкам арганічна

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

ўпісанага ў сыстэму […] Абараняць ад дзяржавы. Антыбеларускай дзяржавы, якой ну ніяк не пасуе гісторыя паводле Караткевіча і літаратура паводле яго не пасуе таксама. […] Абараняць Караткевіча трэба і ад літаратуразнаўцаў".

Падобныя выказванні – часам слушныя, часам смешныя – вынік не толькі поглядаў аўтара, але і агульнага правакацыйна-іранічнага стылю кнігі. *Гамбурскі рахунак…* – гэта не дысертацыйнае даследаванне, дзе ўсё выверана, дакладна, аргументавана, напісана з аглядкай на патэнцыяльных рэцэнзентаў і ВАК, а вольныя разважанні пра беларускую літаратуру вольнага ад усіх пісьменніцкіх саюзаў літаратара, які жыве ў „вольным ганзейскім горадзе Гамбургу". Таму на старонках кнігі сустракаецца шмат трапных заўваг і бліскучых параўнанняў, але нямала і легкадумных выказванняў, неабавязковых разважанняў у стылі „Остапа понесло". Калі прадоўжыць аналогіі са стральбой па мішэнях, можна заўважыць, што ў Бахарэвіча выстралы ў „дзясятку" чаргуюцца з прыкрымі промахамі: як на ўзроўні асобных выказванняў, так і на ўзроўні цэлых эсэ.

Сімптаматычна, што найменш цікавымі і запамінальнымі атрымаліся ў *Гамбурскім рахунку…* якраз эсэ з адназначна станоўчымі героямі, якімі аўтар захапляецца: пра Міколу Гусоўскага, Максіма Багдановіча, Ларысу Геніюш, Уладзіміра Караткевіча. Варта пачытаць гэтыя раздзелы тым, хто абвінавачвае Бахарэвіча ў нелюбові і непавазе да беларускай літаратуры, паслухаць, напрыклад, як апантана абараняе ён вершы Ларысы Геніюш ад нападак ананімнага маладзёна, прыхільніка строга эстэтычнай ацэнкі літаратурных твораў. Высновы „нігіліста" Бахарэвіча дакладна паўтараюць высновы беларускіх літаратуразнаўцаў: Гусоўскі адкрыў Беларусь для Еўропы, Багдановіч адкрыў паэзію для беларусаў, Геніюш пацвердзіла сваю паэзію уласным лёсам, Караткевіч адкрыў Беларусь беларусам. У гэтых раздзелах раз-пораз ужываецца нават слова „павага", якога так рашуча выракаўся аўтар у прадмове да кнігі. У эсэ пра Ларысу Геніюш чытаем: „Таму майма павагу і ўдзячнасць". З эсэ пра Уладзіміра Караткевіча: „Захапленне сышло, а дакладней яго перадаеш іншым, тым, хто мае патрэбу, гэта такая адмысловая бедаруская эстафета. Павага засталася".

Што ж, адмоўныя персанажы атрымліваюцца ў драматургаў больш каларытнымі, чым станоўчыя, ды і акцёрам на сцэне іх потым граць цікавей. Правакацыйна-іранічны стыль, „сцёбная" манера выкладу матэрыялу больш пасуюць фармату радыёперадач і галоўнай ідэі *Гамбурскага рахунку* – ажывіць „музейныя" тэксты, ачысціць ад хрэстаматыйнага глянцу, адабраць у моладзі „шпаргалку павагі" і навучыць чытаць родную літаратуру з цікавасцю і задавальненнем. З іншага боку, стыль – гэта працяг чалавека, як казаў Бюфон, а Бахарэвіча наўрад ці можна лічыць узнёслым рамантыкам і безаглядным аптымістам – ні ў жыцці, ні ў літаратуры. У эсэ *Шэрае на жоўтым* ён піша: „Вячаслава Адамчыка называюць ледзьве не галоўным мізантропам і пэсымістам у беларускай літаратуры. Быццам сапраўднага пісьменніка можна гэтым абразіць". Вядома, нельга. Ні Вячаслава Адамчыка, ні Альгерда Бахарэвіча.

Таму з чытачоў, каму прысутнасць аўтара на кожнай старонцы кнігі не падабаецца – лепш адразу адкласці *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча*. Бо, як сведчыць

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

ужо сама назва, яго, Бахарэвіча, у кнізе шмат, аўтабіяграфічны пачатак і суб'ектыўнасць закладзены ў канцэпцыю зборніка, з'яўляюцца свядомым прыёмам ці нават метадам.

Утвораны прозвішчы ад гэтага імя: Балтрам′ей, Балтрамя′юк, Балтр′ук, Балтрук′овіч, Балтрук′евіч, Балтруш′эвіч, Балтр′ушка, Баўтруш′оў, Баўтр′ушка, Баўтр′ушкін, Баўтравм′овіч, Б′оўтрык, Бутр′ым, Бутрым′овіч, Бат′ура, Бат′ураў, Бат′урын, Батур′эвіч, Батур′онак, Бат′урка, Бат′урчык, Бартал′евіч, Бартас′евіч, Б′арташ, Барт′ош, Барташ′эвіч, Барт′ашык, Барт′ошык, Барташ′ук, Б′артуш, Барт′овіч, Бартк′о, Бартк′евіч, Б′ерташ, Барташ′эўскі, Батур′ыцкі.

Англ. *Bartholomew*, балг. *Вартоломей*, венг. *Bertalan*, *Bartal*, *Bartó*, *Bartos*, іісп. *Bartolomeo*, *Bartolome*, іт. *Bartolomeo*, *Bartolo*, *Bortolo*, літ. *Baltramiejus*, *Baltras*, *Baltrus*, ням. *Bartholomäus*, польск. *Bartłomiej*, *Bartosz*, славац. *Bartolomej*, славен. *Bartolomej*, *Bartolj*, укр. *Бартоломій*, франц. *Bartholomé*, *Barthelemy*, чэск. *Bartoloměj*.

[Арам. імя Bar-Tolmai – сын Талмая]

Імяніны: 30 IV, 5 VII, 24 VIII, 3 IX, 11 XI.

ПЁТР (Piotr) Пятр′а, *м.* Пятровіч, Пятроўна.

Вядома з XIV ст. як Петр (1388), Петро (1726), Петрик (1541), Петрук (1589), Петрок (1540), Пятрок (1746), Петран (1528), Петранец (1540), Петруть (1558), Петрель (1541), Петрули (1556), Петраш (1541), Петрашко(а) (1540), Петроша (1689), Петруша (1580), Петран (1555), Петрас (1585), Петрах (1591), Петко (1528), Петько (1528), Петака (1540), Петюк (1597), Петели (1539), Петкель (1540), Петюль (1558), Петюс (1540), Петя (1540), Пец (1585), Пецько (1566), Пешко (1541), Петрочок (1528), Петруха (1635), Пятрусь (1746).

Вытворныя: Пётра, П′етрык, Петрач′ок, П′етраш, Пятр′аш, Пятр′аша, Пятр′ашка, Пятр′ашка, Пятр′эшка, Пятр′ан, Петрал′ай, Петрас′юк, Пятр′ышча, Пятр′ынчык, Пятр′ук, Петруч′ук, Пятр′уня, Пятр′уцік, Пятр′учык, Пятр′уша, Пятр′ушка, Пятр′ушчык, П′етрусь, Пятр′уцый, Пятк′о, Пятк′ун, П′ецька, Пяц′юль, Пяц′юк, Пяц′як, Пець, Пятр′о.

Утвораныя прозвішчы ад гэтага імя: Пятр′оў, Пятр′овіч, Пятр′энка, Пятр′эня, П′етрык, П′етрыкаў, Петрык′евіч, Пятр′ычыц, Петрач′энка, Петрачк′оў, П′етраш, Пятр′аш, Пятр′ашын, Петраш′эвіч, Пятр′ашка, Петрашк′евіч, Пятр′эшка, Петран′евіч, Петрал′ай, Петрас′юк, Пятр′ышча, Пятр′ышчаў, Пятр′ынчык, Пятр′ук, Петрук′овіч, Петручэ′ня, Петруч′ук, Пятр′унін, Пятр′уцік, Пятр′учык, Пятр′уша, Пятр′ушын, Петруш′энка, Петраш′эня, Пятр′ушка, Пятр′ушкін, Пе-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

трушк′евіч, Пятр′ушчык, П′етрусь, Петрусёў, Петрус′евіч, Петрус′енка, Пятр′уцый, Пятк′о, Пятк′оў, Пятк′евіч, П′етчанка, Пятк′ун, П′ецька, Пяцьк′о, Пяцьк′оў, Пяц′елін, Пяц′юль, Пецюкевіч, Пецяк′оў, Пяцевіч, Петраж′ыцкі, Петрак′оўскі, Петраш′эўскі, Пятр′оўскі.

Англ., нем., славац. *Peter*, балг. *Петър*, *Петьо*, *Пенко*, *Пенчо*, *Пейко*, *Пейо*, *Пешо*, *Пеко*, *Пело*, *Пецо*, *Печо*, *Пепо*, венг. *Péter*, *Petö*, *Petúr*, ісп. *Pedro*, іт. *Pietro*, *Piero*, літ. *Petras*, *Petris*, польск. *Piotr*, руск. *Пётр*, славен. *Peter*, *Pero*, укр. *Петро*, франц. *Pierre*, чэш. *Petr*.

[грэч. *Petros* – скала, уцёс; каменная глыба]

Імяніны: 9, 12, 13, 16, 22, 26, 30 I, 1 II, 24 III, 3, 18 V, 5, 12, 25, 29, 30 VI, 1 VII, 9, 24 VIII, 3, 5, 10, 13, 22, 23 IX, 4, 5, 9 X, 22, 25 XI, 21, 28 XII.

Recenzowany słownik obejmuje imiona zróżnicowane pod względem pochodzenia:

– imiona pochodzenia greckiego, np. Аляксандр, Аліхвер, Аляксей, Андрэй, Васілій, Грыгорый, Дарафей, Дзіянісій, Дзямід, Ерафей, Карп, Кірыл, Кузьма, Мікалай, Мяфодзій, Нікан, Нічыпар, Парфен, Пётр, Сафрон, Сідар, Сцяпан, Трафім, Фама, Фёдар, Філімон, Ціхан, Яўхім; Алена, Анастасія, Варвара, Глафіра, Еўдакія, Ефрасіння, Зінаіда, Зоя, Кацярына, Лідзія, Праскоўя, Софія, Таццяна, Фёкла, Фядора, Яўгенія;

– imiona pochodzenia łacińskiego, np. Антон, Ваніфацый, Валерый, Валянцін, Венядзікт, Віктар, Віталій, Дзям′ян, Емяльян, Ігнат, Кандрат, Канстанцін, Капітон, Клімент, Лука, Лук′ян, Марк, Марцін, Павел, Раман, Сільван, Сяргей, Усцін, Фелікс, Цярэнцій; Беата, Валянціна, Вікторыя, Віялета, Дамініка, Лілія, Маргарыта, Марта, Наталля, Рэгіна;

– imiona pochodzenia hebrajskiego, np. Абрам, Авель, Адам, Амон, Аўдзей, Веньямін, Гурый, Давыд, Елізар, Елісей, Ерамей, Захар, Іван, Ілья, Іосіп, Ісай, Ісак, Лазар, Майсей, Мануіл, Матэвуш, Мацвей, Міхаіл, Навум, Назар, Рафаіл, Самуіл, Серафім, Сіман, Сямён, Фадзей, Фама, Якуб, Яфрэм; Анна, Ганна, Ева, Лізавета, Лія, Марыя, Саламея;

– imiona pochodzenia słowiańskiego, np. Багуміл, Бажен, Вайслаў, Вяслаў, Вячаслаў, Дабраслаў, Дабеслаў, Дакучай, Драгамір, Гаразд, Градзіслаў, Грыміслаў, Ізяслаў, Казімір, Любамір, Любім, Мечыслаў, Мілаван, Миларад, Мілен, Міласлаў, Міраслаў, Мсціслаў, Навамир, Нямир, Нячай, Радамір, Радзім, Радзіслаў, Радмил, Расціслаў, Святаслаў, Станіслаў, Уладзімір, Яраслаў; Дабрыня, Лада, Людміла, Святлана;

– imiona innego pochodzenia, np. Барталамей, Варнава (aram.), Макавей, Руслан (arab.), Артур (celt.), Зарына (pers.), Альгерд, Арнольд, Вальдэмар, Глеб, Густаў, Наль (hind.), Рурык, Эдуард, Эрнст, Эрык (germ.), Алег, Ігар (skand.), Гедымін (lit); Ніна (asyr.), Генавефа (gal.), Заіра (arab.) Вольга, Інгрыда (skand.), Гражына, Данута (lit), Жанна (franc.), Іаданта, Ізабела Інеса, (hiszp.), Стаян Злата (bułg.), Ванда (pol.);

– imiona utworzone po 1917 roku, np. Віл, Вілен, Кім, Ленін, Май, Маркслен, Марлен, Мір, Марат, Навамір, Рыкс, Рэм Рэў, Рэўмір, Трактар; Воля, Ідэя,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

Інтэрна, Іскра, Леніна, Марксіна, Марсельеза, Нінель, Наябрына, Слава, Сталина, Трактарына, Уладзілен, Электрына, Энергія.

Zdecydowana większość używanych przez Białorusinów imion to tradycyjne imiona chrześcijańskie. A. A. Łukaszaniec we wstępie do recenzowanego słownika słusznie zauważa, że cechą charakterystyczną białoruskiego systemu imienniczego jest równoległe występowanie imion należących do trzech odrębnych podsystemów: a) bizantyjsko-prawosławnego (zbliżonego do rosyjskiej tradycji nazewniczej), b) rzymskokatolickiego (zbliżonego do polskiego systemu imienniczego), c) białoruskiego (w znacznym stopniu odbiegającego od dwóch pozostałych podsystemów imienniczych). Część imion należących do wymienionych podsystemów nie wykazuje zróżnicowania, por. Адам, Мірон, Пётр; Анна, Дар'я, inne zdecydowanie się różnią, por. Фама і Тамаш, Іван і Ян, Іосіф і Юзаф, Улас і Блажэй, Фадзей і Тадэвуш.

Na Białorusi są notowane formy imienne ukształtowane na gruncie białoruskim, które są niekiedy częściej używane niż ich odpowiedniki urzędowe, na ogół tożsame z tradycyjnymi imionami prawosławnymi, por. Васілій – Васіль, Якаў – Якуб, Іосіф – Язэп, Яўстафій – Астап, Грыгорый – Рыгор. To zjawisko nie zostało przedstawione w recenzowanym słowniku w sposób wyczerpujący i konsekwentny. Imiona Васіль, Язэп, Астап, Рыгор występują w słowniku jako formy hasłowe. Tej funkcji natomiast nie pełnią takie popularne białoruskie formy imienne, jak Мікола, Міхась, Пятро, Янка, Язэп. Tymczasem formy te są często używane na Białorusi w funkcji nazw oficjalnych.

Na Białorusi coraz częściej są wysuwane postulaty powrotu do białoruskich wariantów imion chrześcijańskich, por. „[…] трэба вяртаць у шырокі ўжытак мясцовыя варыяцыі хрысціянскіх і дахрысціянскіх імёнаў: Ян, Тадэвуш, Алесь, Яніна, Паўліна, Ядвіга, Рагнеда, Багуміл, Дружыла, Ярыла, Зора, Мілавіца".[35] Podkreśla się, że tego typu imiona odróżniały białoruski system imienniczy od pozostałych systemów wschodniosłowiańskich, w tym również od rosyjskiego, por. „Трэба вярнуць ва ўжытак старыя беларускія імёны, якія нас так вылучалі".[36]

W recenzowanej książce autorka nie rozróżnia imion urzędowych i kanonicznych, co czyni słownik mniej przejrzystym. Czytelnik mimowolnie zadaje pytanie, czy formy imienne uznane za urzędowe są rezultatem niekiedy daleko idących przekształceń imion prawosławnych na gruncie białoruskim, czy też są tylko białoruskimi odpowiednikami rosyjskich imion urzędowych, zapisanych zgodnie z obowiązującymi w języku białoruskim zasadami ortograficznymi. W drugim przypadku tracimy z pola widzenia *уласна беларускія* formy imienne, ukształtowane na gruncie białoruskim na bazie imion kanonicznych (prawosławnych i katolickich).

Dokonana przez autorkę słownika analiza etymologiczna imion nie budzi poważniejszych zastrzeżeń. Może jednak budzić wątpliwości dążenie autorki do jednoznacznego określania pochodzenia uwzględnionych w słowniku imion. Wydaje sie, że w niektórych przypadkach bardziej celowe byłoby przyjmowanie alternatywnych rozwiązań, ponieważ

[35] „Наша Ніва" nn.by, 20 лістапада 2013, *http://nn.by/?c=ar&i=106682*.
[36] *Ibidem*.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

pochodzenie wielu imion jest ustalane przez badaczy w zróżnicowany sposób, por. imię Ігнат, Марк, Лаўрын, Севасцьян.

Imię Ігнат autorka wyprowadza z łac. *Ignatius* < *ignesus* 'ogniowy'. Wielu badaczy wywodzi to imię od *Ignatius* < *Egnatius* 'rzymskie imię rodowe', a to od łac. *ignotus* ‚niewidomy', 'nieznajomy'. Inni łączą to imię z łac. *ignis* 'ogień' i *natus* 'narodzony'.[37] Niektórzy badacze uważają, że badane imię jest pochodzenia etruskiego. Pochodzenie badanego imienia jest uznawane przez większość badaczy za niejasne.[38]

Imię Марк jest w recenzowanym słowniku wyprowadzane z łac. *Markus* < *marceo* 'zwiędnięty, słaby'. W innych opracowaniach pochodzenie tego imienia jest ustalane w zróżnicowany sposób: 'urodzony w marcu', 'zwiędnięty, słaby', por. łac. *marcēre* 'być słabym, wątłym', 'wojowniczy', por. imię rzymskiego boga wojny Marsa, poświęcony Marsowi, należący do Marsa, 'młotek'.[39]

Imię Севасцьян autorka wyprowadza z gr. *Sebastianos*, por. *sebastos* 'czcigodny, dostojny, wysoko postawiony'. Bywa także uznawane za imię pochodzenia łacińskiego, por. *Sebastianus* 'mieszkaniec Sebastii'.

Drobne nieścisłości obserwuje się w interpretacji pochodzenia imion Ануфрый, Дзям'ян, Майсей, Максім, Назар, Сава, Улас, Фама.[40]

Imię	Pochodzenie imienia w słowniku	Uwagi o pochodzeniu imienia
Ануфрый	greckie	pochodzenie imienia niejasne, uznawane za greckie lub egipskie
Дзям'ян	łacińskie	większość badaczy opowiada się za greckim pochodzeniem tego imienia, niektórzy badacze wyprowadzają je z łaciny
Майсей	hebrajskie	pochodzi z języka hebrajskiego lub egipskiego
Максім	greckie	imię pochodzenia łacińskiego
Назар	hebrajskie	imię zawiera rdzeń hebrajski, lecz zostało zapożyczone z łaciny
Сава	greckie	imię przejęte do języka greckiego i łacińskiego z aramejskiego
Улас	greckie	imię pochodzenia łacińskiego
Фама	hebrajskie	imię pochodzenia aramejskiego

W recenzowanym słowniku odnotowano nieliczne błędy techniczne: brak odstępów między wyrazami, zwłaszcza w pozycji przed lub po nawiasie, powtórzenia tych samych form imiennych przy wyliczaniu.

Odnotowane drobne mankamenty nie umniejszają w żadnym stopniu wartości recenzowanego słownika autorstwa A. K. Uscinowicz. Do rąk czytelnika zaintereso-

[37] J. Stankiewicz, *Genealogia, przodkowie, badania genealogiczne, forum dyskusyjne*, *http://www.stankiewicz.e.pl/index.php?kat=44*; І. І. Трійняк, *Словник українських імен*, Київ 2005.

[38] І. І. Трійняк, *op. cit*., с. 90.

[39] Л. Г. Скрипник, *Власні імена людей*, Київ 2005, с. 75; M. Sajewicz, *Nazwiska patronimiczne z formantem -uk w powiecie hajnowskim na Białostocczyźnie na tle ogólnopolskim*, Lublin 2013, s. 157–158.

[40] *The Kurufin's Castle. Европейские имена: значение и происхождение*, kurufin.ru/html/ Rus_names/rus_f.html; Н. А. Петровский, *Словарь русских личных имён*, Москва 2005; І. І. Трійняк, *op. cit*.; J. Stankiewicz, *op. cit*.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

wanego białoruskim imiennictwem osobowym trafiła książka wartościowa i rzetelnie napisana. Jest to najpełniejszy jak dotąd słownik imion białoruskich, przygotowany poprawnie pod względem merytorycznym i metodologicznym. Książka zainteresuje w pierwszym rzędzie onomastów, lecz sięgną po nią również czytelnicy, którzy nie zajmują się językoznawstwem zawodowo, często jednak zadają sobie pytanie, skąd pochodzi imię, które noszą, i jak ono funkcjonuje w określonej społeczności.

Michał Sajewicz

Joanna Kuć, *Antroponimia pogranicza mazowiecko-podlaskiego (na podstawie XVII-wiecznych ksiąg parafialnych z Mokobód),* Siedlce 2011, 283 s.

Nazewnictwo osobowe Podlasia i Mazowsza jest opracowywane przez onomastów już od kilkudziesięciu lat. Powstało w tym okresie wiele interesujących prac omawiających różnorakie aspekty antroponimii obu regionów.

Monografia autorstwa Joanny Kuć stanowi kolejne ogniwo w tym swoistym „łańcuchu" opracowań onomastycznych. Autorka omawia w niej strukturę i semantykę antropoleksemów wyekscerpowanych z *Liber baptisatorum* i *Liber copulatorum* parafii rzymskokatolickiej Mokobody za lata 1651–1700. Istotną część tego opracowania stanowi *Słownik XVII-wiecznych nazw osobowych z Mokobód*.

Recenzowana książka powinna zadowolić zarówno specjalistów (językoznawców, onomastów), jak i czytelników sięgających po tę książkę tylko dlatego, żeby odnaleźć w niej własne nazwisko i dowiedzieć się, od czego pochodzi i w jaki sposób zostało utworzone.

Niewątpliwą zaletą recenzowanej książki jest wszechstronna, wnikliwa analiza językowa antroponimów historycznych mieszkańców Mokobód i okolic. Przedmiotem analizy są zarówno męskie, jak i żeńskie nazwy osobowe. Na uwagę zasługuje zwłaszcza dogłębne potraktowanie przez autorkę sposobu nominacji kobiet w II połowie XVII w. Jest to istotne z uwagi na to, że niektóre opracowania z zakresu antroponimii poświęcają temu zagadnieniu niewiele miejsca.

Recenzowana rozprawa świadczy o tym, że Joanna Kuć zna doskonale specyfikę historycznego nazewnictwa osobowego. Autorka zdaje sobie sprawę z tego, że proces formowania się nazwisk na pograniczu mazowiecko-podlaskim nie zakończył się w XVII w., lecz trwał jeszcze w wiekach XVIII i XIX.

Wypada tylko żałować, że autorka nie zdecydowała się na opracowanie XVIII- i XIX-wiecznych nazw osobowych Mokobód i okolic. Pozwoliłoby to na pełniejsze opisanie mechanizmów, które doprowadziły do uformowania się współczesnych nazwisk mieszkańców badanego terenu.

Jest ze wszech miar pożądana kontynuacja badań nad antroponimią pogranicza mazowiecko-podlaskiego, ze szczególnym uwzględnieniem procesu kształtowania się nazewnictwa osobowego w XVIII–XIX wieku.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

W tym miejscu nasuwa się również spostrzeżenie, że baza źródłowa monografii mogła zostać wzbogacona o zachowane XVII-wieczne rejestry podatkowe ziemi drohickiej oraz księgi grodzkie i ziemskie drohickie, pochodzące z tego samego okresu. Wprowadzenie nowego, często odmiennego, materiału nazewniczego, pozwoliłoby na porównanie sposobu nominacji osób w zależności od rodzaju źródła, a to poszerzyłoby na pewno perspektywę badawczą.

Niewątpliwym atutem monografii jest właściwe ukazanie specyfiki nazewnictwa drobnej szlachty. Autorka używa w swoich rozważaniach m.in. terminu „przydomek szlachecki", podczas gdy niektórzy onomaści chcieliby w nim widzieć nazwisko, lub po prostu nazwę osobową. Pewne zastrzeżenia może budzić jedynie rozszerzenie grupy nazw heraldycznych o antroponimy, które wcale nie muszą należeć do kategorii nazw odherbowych.

Te drobne uwagi nie wpływają na ogólną wysoką ocenę recenzowanej książki. Omawiana monografia jest wielowątkowa i nie sposób w tej recenzji odnieść się do wszystkich istotnych problemów poruszanych przez autorkę. Wypada tylko zachęcić potencjalnych czytelników do lektury tej niewątpliwie interesującej i cennej pozycji bibliograficznej.

Piotr Złotkowski

Таццяна Расціславаўна Рамза, *Беларускае гутарковае маўленне: сучасны стан. З электронным дадаткам*, „Вышэйшая школа", Мінск 2011, 224 с.

Тое, што сказаў Адам Супрун у 1989 г. і пра што ўзгадвае аўтарка ў публікацыі: „На жаль, беларускае вуснае маўленне вывучана яшчэ ў зусім недастатковым аб'ёме" (с. 16) – можна паўтарыць і сёння, хоць вельмі важны і ўпэўнены крок у гэтым накірунку зрабіла менавіта Таццяна Р. Рамза. У працы парушае не толькі праблему вымаўлення (фанетыкі) (с. 46–87), тэрміналогіі (с. 14–16), але і прэстыжу беларускай мовы ўвогуле (с. 17).

На ўвагу заслугоўвае агляд сучасных даследаванняў, якія датычаць вуснага маўлення беларусаў не толькі айчынных, але і замежных вучоных. Аб'ектам даследавання дасюль было: вясковае (дыялектнае) маўленне і яго ўзаемадзеянне з суседнімі мовамі (польскай, літоўскай, украінскай, рускай), а таксама гарадское маўленне ў адносінах да рускай і беларускай кадыфікаваных моў і дыялектаў – нелітаратурнае змешанае маўленне беларусаў. Аўтарка заўважае, што ўласнабеларускае гутарковае маўленне не так часта выбіраецца як аб'ект даследавання. Т. Рамза падкрэслівае тое, што ўвагу засяроджвае на выданнях, „высновы якіх грунтуюцца на запісах […] вуснага маўлення беларускамоўнай інтэлігенцыі, людзей, што выразна ўяўляюць сабе нормы кадыфікаванай беларускай мовы" (с. 14).

Патрэба прызнаць, што даўно ў беларускім мовазнаўстве не было выказана так шмат адважных меркаванняў на тэму вуснага маўлення агульнай беларускай мовы. Мы нават прызвычаіліся да традыцыйнага падыходу, паводле якога

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

вусныя і пісьмовыя тэксты адрозніваюцца функцыянальна, належаць да афіцыйна-дзелавых, публіцыстычных, навуковых, мастацкіх ці размоўных (гутарковых), часам выдзяляюцца яшчэ канфесійныя тэксты. Рэдка звяртаецца ўвага на афіцыйнасць / неафіцыйнасць размоўнай сітуацыі, падрыхтаванасць / непадрыхтаванасць маўлення, урэшце – на існаванне, побач з нормамі кадыфікаванай мовы, рэальнага стану маўлення (напр. Г. Цыхун называе яго тэрмінам *рэпрэзентатыўнасць*, спасылка на с. 64) і гутарковага ўзусу.

– Дарэчы, падобным чынам выглядае і справа самой агульнай (агульнанацыянальнай) мовы. Валеры Пісарэк пра агульную (агульнанацыянальную) мову – у дачыненні да польскай мовы – пісаў: „гэта агульная культурная разнавіднасць нацыянальнай беларуский мовы, якая, у адрозненні ад усіх іншых рэгіянальных тыпаў і сацыялектаў, папулярызуецца школай, адміністрацыяй, літаратурай і прэсай, павінна быць сродкам паразумення ва ўсіх галінах усіх членаў народу без падзелу на пол, узрост, прафесію, грамадскае і тэрытарыяльнае паходжанне". Дадаючы яшчэ цытату з Зенона Клемянсевіча: „Яе нормы ўстанаўліваюцца і распаўсюджваюцца ў падручніках польскай граматыкі, у арфаэпічных і арфаграфічных правілах; яе лексічны склад фіксуюць шматтомныя слоўнікі. Яе існаванне ёсць адзін з вынікаў агульнай адукацыі, адна з адзнак дасягнення культурнага ўзроўню ў агульнанацыянальным маштабе".[41] У традыцыйным беларускім моўназнаўстве такая разнавіднасць (кадыфікаваная) называецца літаратурнай мовай. Гэтая назва неаднойчы выступае і на старонках дадзенай манаграфіі.

Публікацыя складаецца з трох асноўных частак: *З гісторыі вывучэння вуснай беларускай літаратурнай мовы*, *Агульныя пытанні вывучэння беларускага гутарковага маўлення*, *Фанетычныя асаблівасці гутарковага маўлення* і *Тэкстаў* (50 тэкставых фрагментаў).

Зазначана, што „для намінацыі феномена штодзённага маўлення носьбітаў літаратурнай беларускай мовы" „у беларускамоўным лінгвістычным дыскурсе" (с. 15) няма агульнапрынятага тэрміна. Неаднойчы выкарыстоўваюцца вельмі разбудаваныя назвы, якія канкрэтызуюць аб'ект назірання і аналізу. Аўтарам прапануецца тэрмін *гутарковае маўленне*, аналанічны (калька) да руск. *разговорная речь* і укр. *розмовне мовлення*. Ягонае значэнне таксама перанята ад расійскіх навукоўцаў, прызнанае і ўкраінскімі вучонымі, менавіта: „разнавіднасць літаратурнай мовы, якая выкарыстоўваецца ва ўмовах нязмушанага вуснага маўлення, непадрыхтаванага, спантаннага, што нараджаецца ў момант гутаркі; яно ўзнікае з патрэбы непасрэднага паразумення дзвюх ці больш асоб і сродка такой камунікацыі" (с. 16). Аўтарам на жаль іншыя погляды на „спантанную камунікацыю" не разглядаюцца (с. 16, спасылка), карысна было б, як нам здаецца, узгадаць іх сутнасць, няхай бы і крытычна. Тым больш, што не ўсе яны шырока вядомыя ў колах навукоўцаў на Беларусі (асабліва маладых).

[41] W. Pisarek, *Język ogólny*, [w:] *Encyklopedia języka polskiego*, red. c. Urbańczyk, Wrocław–Warszawa–Kraków, 1994, c. 135.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

Затое спадарыня Рамза робіць даволі працяглыя ўводзіны да вывучэння гутарковага маўлення на Беларусі, разглядае праблему станаўлення беларускай літаратурнай мовы і яе кадыфікацыі. Фрагмент працы, прысвечаны агляду літаратуры 20-ых гадоў XX стагоддзя, паказаў на колькі складаны гэта быў перыяд нават для саміх філолагаў, пісьменнікаў, публіцыстаў. Трэба было неадкладна вувучаць яе і папулярызаваць сярод сялян, рабочых і служачых (с. 17). Экскурс у лінгвістычную літаратуру таго часу, што, безумоўна, будзе цікава і немовазнаўцам, распавядае пра выбар сербскай мадэлі, пра вырашэнне не адрываць кніжную мову ад размоўнай народнай стыхіі. Простая мужыцкая мова мела стацца і мовай кніжнай (= літаратурнай) (с. 17).

Беларуская інтэлігенцыя, на жаль, не ўмела гаварыць і думаць па-беларуску, яна атрымала выхаванне па-руску або па-польску і карысталася тымі мовамі ў сям'і і паза ёй, адначасова „псавала" яе чужымі элементамі. У якасці „чужых элементаў" разглядаюцца, галоўным чынам, фанетыка, марфалогія і сінтаксіс, а не лексіка. Узорам вуснага маўлення лічылася жывая народная мова, паколькі яе карыстальнікі не перасталі ніколі на ёй думаць (с. 19).

Беларускую мову патрэбна было ўвесці ў „паўсядзённы быт", ва ўсе сферы жыцця. Каб стабілізаваць літаратурныя нормы, звярталася ўвага на „узорны нацыянальна-культурны асяродак", такім асяродкам меў стацца Мінск з яго-нымі ўстановамі адукацыі, навукі і культуры. Педагогі, мовазнаўцы, грамадска-палітычныя дзеячы імкнуліся ўмацаваць пазіцыі беларускай мовы, а таксама стварыць яе культ у гарадскім побыце. Важная роля адводзілася нацыянальнай школе і тэатру. Калі чытаем тыя радкі сёння, здаецца, што яны не страцілі сваёй актуальнасці і зараз, у сучаснай Беларусі. Звужэнне функцынавання беларускай мовы ў сучасным беларускім грамадстве, адсутнасць падтрымкі з боку дзяржаўнай палітыкі, нізкі прэстыж беларушчыны нагадвае пачатак XX ст., не хапае толькі энтузіязму, які характэрны быў дзеячам 20-ых гадоў мінулага стагоддзя. Пра гэта піша і Т. Рамза (с. 34–35).

Як сцвярджаюць сёння вучоныя, тагачасныя дыскусіі дзеячоў беларускай культуры, выдавецкая дзейнасць рэдакцый газет і часопісаў, тэатральная дзейнасць – усё гэта спрыяла пашырэнню сферы функцыянавання вуснай формы агульнай (кадыфікаванай) мовы. Для выпрацоўкі ўзору вымаўлення асноўную ролю адыграў аўтарытэт такіх мастакоў слова, як Я. Купала і Я. Колас. „Выкрышталізаваць нормы кніжнай мовы", а не даследаваць яе вусную форму, было на той час першаснай задачай мовазнаўцаў.

Сярод іншых вартых увагі высноў Т. Рамза падкрэслівае, што мовазнаўцы 20–30-ых гадоў XX стагоддзя прыйшлі да меркавання, паводле якіх „прычыны і разбуральныя наступствы так званай сёння *трасянкі* (а тады „*лунных лап*" ці *жаргону*)" знаходзяцца ў „адсутнасці беларускамоўнага выхавання і, як вынік, няўмення «думаць па-беларуску»" (с. 35). І гэтыя словы можна таксама аднесці да сучаснай моўнай сітуацыі ў краіне.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

У другой палове XX стагоддзя, у пасляваенныя гады, для пашырэнне беларускай мовы склаліся неспрыяльныя акалічнасці. Лінгвісты даследавалі, як правіла, пісьмовы яе варыянт. Сітуацыя змянілася ў 60-ыя гады, калі былі зроблены істотныя крокі ў вывучэнні гутарковага маўлення – як дыялектнага, так і кадыфікаванага. Толькі ў гэты час былі сфармуляваны „асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення" (с. 24). Нягледзячы на 20–30-ыя гады XX стагоддзя і памкненні тагачасных прыхільнікаў беларусізацыі, руская мова далей панавала ва ўсіх сферах камунікацыі. Не хапае, як здаецца, у гэтым месцы хоць кароткага каментара, чаму так здарылася.

Тагачасныя даследаванні гутарковага маўлення, з аднаго боку, паказалі, што „агульнанародная вусная форма беларускай гутарковай мовы не ўсталявалася" (с. 24), а, з другога, што шматлікія публікацыі і дысертацыі разглядаюць асобныя з'явы размоўнага стылю на прыкладзе беларускай літаратурнай спадчыны або прысвечаны размоўнаму стылю ў творчасці пэўных аўтараў (с. 24–25). Рысы размоўнага стылю ў параўнанні з іншымі функцыянальнымі стылямі сучаснай беларускай мовы разглядаюцца ў дапаможніках па стылістыцы беларускай мовы (с. 25). Гутарковая мова, у адносінах да беларускай мовы, – гэта на той час часта ўмоўнае азначэнне, паколькі запісаў вуснага спантаннага маўлення існавала вельмі мала. Больш даследчыкі карысталіся запісамі жывога вясковага маўлення (дыялекталагічным матэрыялам) або рэплікамі з драматычных твораў, дыялогамі з празаічных тэкстаў, інакш стылізаваным гутарковым маўленнем (с. 26), як гэта зрабілі і аўтары *Частотнага слоўніка беларускай мовы: гутарковая мова,* Надзея Мажэйка і Адам Супрун.

Сярод эксперыментальных даследаванняў у галіне фанетыкі беларускай мовы аўтарам дадзенай манаграфіі націск кладзецца на вынікі назіранняў Аляксандра Падлужнага і ягонага калектыву, які яшчэ ў 70-ыя гады мінулага стагоддзя заўважыў, што размоўнаму стылю вымаўлення характэрная „менш выразная артыкуляцыя, рэдукцыя спалучэнняў зычных і нярэдка іх поўная асіміляцыя" (с. 27). Дапушчальнасць у размоўным стылі тых ці іншых з'яў, супастаўленая з артыкуляцыйнай нормай кадыфікаванай мовы і асаблівасцямі дыялектнага вымаўлення – вельмі істотныя „для выяўлення гутарковага ўзусу" (с. 28).

У пазнейшых даследаваннях, паміж іншым, разглядаліся „змены зычных ў моўнай плыні" (А. Падлужны, П. Садоўскі), ненаціскныя галосныя ў плынным маўленні (Л. Выгонная), звярталася ўвага на пытанне: як гавораць носьбіты і як трэба гаварыць, пры чым літаратурнае вымаўленне разглядалася таксама як вынік „агульных славянскіх ці ўсходнеславянскіх сінхронных працэсаў" (за П. Садоўскім). Гэтыя вынікі вучоныя-лінгвісты атрымалі на падставе аналізу выступленняў пісьменнікаў і дыктараў (манаграфія *Фанетыка слова ў беларускай мове*, 1983). Мовазнаўцы сцвердзілі, што на вымаўленне гукаў у моўнай плыні ўплываюць шматлікія фактары: індывідуальныя асаблівасці мовы, прафесійныя адрозненні ў маўленні, суседства гукаў у слове (сказе), стылістычная прыналежнасць тэксту, пазіцыя зычных і г.д.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

У наступных працах была, між інмшым, зроблена спроба апісаць беларускую інтанацыю, параўнаць вымаўленне гукаў у беларускіх і запазычаных словах (*Фанетыка беларускай літаратурнай мовы*, 1989). Выйшла хрэстаматыя дыялектных і мастацкіх тэкстаў у спрошчанай транскрыпцыі (*Вусная беларуская мова*, 1990), трэцяя пасля *Хрэстаматыі беларускай дыялекталогіі*, 1962 і *Беларускай дыялекталогіі*, 1979 Эвяліны Мяцельскай і Яўгена Камароўскага. Упершыню тэксты агучвалі не жыхары вёскі, толькі асобы, якія выкарыстоўвалі беларускую мову ў прафесійнай практыцы, пры чым не толькі пісьменнікі і дыктары, але таксама артысты, настаўнікі, навуковыя супрацоўнікі. Аўтары, як і раней, параўноўвалі рэальнае вымаўленне да т.зв. „літаратурнага", згоднага з арфаэпічнымі правіламі, і прыйшлі да высновы, што ён на практыцы ажыццяўляецца рэдка, асабліва ў асоб з дысімілятыўным аканнем у першым моўным кодзе. Яно мае вельмі ўстойлівы характар, і таму прапануецца не лічыць такой вымовы парушэннем норм. Гэта было істотнай высновай, якая праілюстравала, як піша аўтарка кнігі, „змену навуковага стаўлення ў беларускай лінгвістыцы да гутарковага маўлення" (с. 32).

Далей разгледжаны навуковыя пошукі Лілії Выгоннай, якія датычылі мовы радыёкарэспандэнтаў. Вынікі даследавання сабраны, між іншым, у манаграфіях *Інтанацыя. Націск. Арфаэпія*, 1991 і *Беларуская мова*, 1998. Публікацыі можна лічыць наватарскімі, паколькі Л. Выгонная прапанавала, каб у „рэкамендацыях нарматыўнага характару" улічваць, „як на самай справе гавораць носьбіты мовы", што нельга ігнараваць узус гутарковага маўлення, што наспела вялікая патрэба стварыць арфаэпічны слоўнік-даведнік узорнага вымаўлення, але і адначасова „адрасаваць арфаэпію для розных катэгорый карыстальнікаў" і г.д. Многія высновы прац вучонай сугучныя з папярэднімі даследаваннямі П. Садоўскага.

Зыходзячы з напрацовак навукоўцаў мінулага стагоддзя, Т. Рамза вырашыла „пачаць вывучэнне стану гутарковага маўлення XXI ст. на аснове запісаў непадрыхтаваных неафіцыйных размоў прафесійных філолагаў, якія сваю пачатковую ці сяроднюю адукацыю атрымалі ў беларускамоўных школах і кар'ерны рост якіх звязаны са сталіцай" (с. 35). Даследчыца аналізуе выключна тэксты адной узроставай (20–45 гадоў) і адной прафесійнай групы – выкладчыкі ВНУ і навуковыя супрацоўнікі, прычым толькі філолагі (с. 38). З аднаго боку гэта добра, бо ведаем, хто так гаворыць, але з іншага боку, ці адпаведная тады назва даследавання як *Беларускае гутарковае маўленне: сучасны стан* (можа: *Гутарковае маўленне беларускамоўных вучоных / філолагаў сярэдняга ўзросту*?). Размоўнай мовай, няхай у шматлікіх выпадках і абмежавана, карыстаюцца як навукоўцы, так і пісьменнікі, мастакі, артысты, настаўнікі, студэнты, вучні. Запісы зроблены ў 2007–2010 гг. Усе суразмоўцы двухмоўныя, носьбіты кадыфікаваных беларускай і рускай моў, але штодзённа карыстаюцца пераважна беларускай мовай.

Мэтай даследавання з'яўляецца „выявіць […] маўленчыя з'явы, […] якія складаюць так званы гутарковы ўзус – нікім не прапісанае, але калектыўна прынятае выкарыстанне моўных адзінак" (с. 37). Аўтарка не бярэцца параўноваць

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 05:14:11

жывога маўлення з норамі кадыфікаванай беларускай мовы (як гэта рабілася доўгі час), каб выявіць ўласна гутарковыя фанетычныя адзінкі, не разглядае іх як адхіленне ад нормы, толькі як асаблівасць ці заканамернасць мовы (с. 37). Разам з тым, у перспектыве, знойдзеныя адметнасці маглі б ілюстраваць адрозненні паміж штодзённым маўленнем і афіцыйна-кадыфікаваным (с. 50).

У якасці аб'екта даследавання аўтарка абмежавалася да абраных фанетычных асаблівасцей гутарковага маўлення. Наўрад ці той, хто вывучаў беларускую мову як замежную, можа дапускуіць, што рысай беларускага вакалізму ёсць „іканне" (зусім іншае – „аканне"!). Спадарыня Т. Рамза даводзіць нам, што ў гутарковай мове назіраецца нейтралізацыя гукаў ['а] і [і] у першым пераднаціскным складзе ў лексікалізаваных адзінках (*німа, ніхай, дзівяты, ціпер, міне, цібе* і г.д.), што гэтая з'ява не вынікае выключна з ўздзеяння фанетыкі рускай мовы (хутчэй з ёй супадае), а з'яўляецца працягам фанетычных рыс дыялектнай мовы.

Сярод кансанантычных з'яў у манаграфіі разгледжаны: „узрастанне частотнасці вымаўлення выбухнога [г] на стыку слоў", нейтралізацыя выбухнога [г] са шчылінным [г] у лексікалізаваных адзінках (*гузік, ганак, агрэст* і г.д.), у слове *гэта* можа вымаўляцца не толькі фрыкатыўнае і прыдыхальнае [h], але можа таксама знікаць, на стыку слоў і марфем афрыката [ц"] няўстойлівая. Усе гэтыя з'явы распаўсюджаныя ў беларускіх гаворках і выкліканыя іх уплывам.

Меркаванні мовазнаўцы суадносяцца з вынікамі даследаванняў папярэднікаў. Назіранні ілюструюцца прыкладамі-дублетамі, супастаўленымі ў табліцах, картамі з *Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы* (1973).

З тэхнічнага боку, нам падаліся нязручнымі спасылкі, яны трохі нязвыкла пазначаныя зорачкамі, але маюць для кожнай старонкі асобную нумарацыю і гэта якраз добра і выгодна. Патрэбна ж заўважыць, што інфармацыя, якая ў спасылках знаходзіцца, не менш важная і карысная, чым асноўны тэкст.

Як нам здаецца, не толькі сам аналіз з'яўляецца змястоўным, цікавым і становіць вартасць, але таксама эмпірычны матэрыял, на аснове якога манаграфія падрыхтавана. У беларускім мовазнаўстве звычайна аналізаваліся тэксты дыялектнага і літаратурнага вуснага маўлення. Тут жа, ці не ўпершыню, запісаны і прадстаўлены ў транскрыпцыі такі аб'ём (50 тэкстаў) спантаннай, непадрыхтаванай гутарковай мовы. Выбраная спрошчаная транскрыпцыя запісаў дазваляе карыстанне кнігай не толькі мовазнаўцам. Аудыёфайлы сабраны на электронным дыску і дададзены да кнігі, што толькі станоўча пра яе сведчыць.

На нашу думку публікацыя толькі паспрыяе вырашэнню пытанняў *Што ж такое беларускае гутарковае маўленне*? *Што складае ягоны ўзус*? *Як суадносяцца заканамернасці гутарковага маўлення з яго варыянтыўнасцю*? і г.д. – пытанняў, якія сфармулявала сама аўтарка (с. 35). Манаграфія можа быць паспяхова выкарыстана і ў якасці ўніверсітэцкага падручніка на філалагічных аддзяленнях.

Jadwiga Kozłowska-Doda